Э.Р.Іофэ

# ГЭТА БЫЎ ХАЛАКОСТ

ХАЛАКОСТ (Holocaust,Holokaust,Holokast) (Халакауст або Халакост) – элінскае слова, якое азначае масавае знішчэнне, асабліва чалавечых жыццяу, агнем, усеспальванне да канца, да апошняй крупіцы цела і душы, да апошняй частачкі жыцця. Пад гэтым спецыфічным тэрмінам, які увайшоу у ужытак у значнай частцы свету падразумяваюць забойства мільенау еурапейскіх яурэяу у час другой сусветнай вайны. Яго сінонімамі зьяуляюцца тэрміны "Катастрофа" і "Шоа" (у Дзяржаве Ізраіль), якія па сэнсу вельмі блізкія да агульначалавечага – "Генацыд (супраць яўрэяў)".

Тэрмін "Халакост" атрымаў шырокае распаусюджванне з з'яўленнем ядзернай зброі, аллюстравaушы пагрозу самазнішчэння чалавецтва, якая ўтойваецца у гэтай зброі. Таму тэрмін "ядзерны халакост" заняу трывалае месца ў лексіконе ключавых слоў, звязаных з праблемай існавання тэрмаядзернай зброі як адной з важнейшых глабальных праблем чалавечага развіцця на сучасным этапе.

У час другой сусветнай вайны нацысты знішчылі на тэрыторыі Еўропы 6 млн яўрэяў. Гэта быу самы трагічны перыяд за ўсю гісторыю яўрэйскага народа. Нацысцкая Германія праводзіла у адносінах да яурэяу палітыку татальнага знішчэння, якая атрымала назву "канчатковае вырашэнне яурэйскага пытання". Сам факт прыналежнасці да яўрэйскага народа прадвызначау гібель чалавека. Зразумела, забівалі не толькі яўрэяў. Ахвярамі нацысцкага тэрору сталі палякі, рускія, беларусы, украінцы, чэхі, французы. Так, народ Беларусі у час Вялікай Айчыннай вайны страціу кожнага трэцяга свайго жыхара. Аднак у адносінах да неяўрэяў (за выключэннем цыган) не праводзілася палітыка татальнага знішчэння.

Адзін з найбольш змрочных бакоу гэтай трагедыі – знішчэнне беларускага яўрэйства. На вялікі жаль, вельмі цяжка вызначыць дакладныя лічбы ахвяр Халакоста на

беларускай зямлі. Складанасць вырашэння дадзенай праблемы у тым, што няма дакладных звестак аб колькасці як яўрэйскага, так і агульнай колькасці насельніцтва Беларусі на момант акупацыі рэспублікі (чэрвень—жнівень 1941 г.). Па перапісу на 1 студзеня 1939 г. у БССР пражывала 375 092 яўрэя. Улічваючы сярэднегадавы прырост яўрэйскага насельніцтва у 1939—1941 гг., есць усе падставы меркаваць, што да пачатку вайны на тэрыторыі рэспублікі жыло каля 405 000 яўрэяў.

Колькі ж жыло яўрэяў у Заходняй Беларусі? Дадзеныя розных крыніц даволі супярэчлівыя. На студзень 1939 г., па падліках П.Эберхардта, там жыло 316 300 яўрэяў, або 8.8% усяго насельніцтва. Па падліках М.Воляцыка, усяго у 1941 г. насельніцтва Заходняй Беларусі складала прыблізна 5 млн. чалавек, з якіх беларусы складалі 77%, яўрэі – 12,8%, рускія – 5,1%, літоўцы – 1,3%, палякі – 1.3%, украінцы – 1,3%, іншыя – 1% [1].

З моманту напалу фашысцкай Германіі на Польшчу на тэрыторыі Беларусі, паводле дадзеных А.Хацкевіча, пражывала каля 100 тыс. бежанцаў, галоўным чынам, з спрадвечных польскіх тэрыторый. 90% гэтых бежанцаў, ці 90 тыс. чалавек, складалі яўрэі. Іншыя даследчыкі называюць лічбу ў 200 тыс.бежанцаў.

Такім чынам, на тэрыторыі Заходняй Беларусі напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны пражывала ад 400 тыс. да 640 тыс. яўрэяў.

Колькі ж яўрэяў жыло у Беларусі у чэрвені 1941 г.?

На думку польскага даследчыка Ю.Туронка, у межах сучаснай тэрыторыі рэспублікі іх было 700—750 тыс. [2].

Паводле нашых падлікаў, напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны, на тэрыторыі Беларускай ССР (у сучасных межах) жыло ад 915 да 1 млн. яўрэяў. З улікам 150 тыс. эвакуіраваных і 110 тыс. мабілізаваных у Чырвоную Армію, на тэрыторыі Беларусі, акупіраванай гітлераўцамі, засталося 655—740 тыс. яўрэяў.

Колькі ж яўрэяў сталі ахвярамі Халакосту на беларускай зямлі?

Р.Чарнаглазава адзначае, што ў выніку злачынных дзеянняў акупантаў на беларускай зямлі знішчана 400 тыс. яўрэяў [3], а на думку А.Лейзерава — 800 тыс [4]. Я.Разэнблат лічыць, што толькі о Заходняй Беларусі загінула да 500 тыс. яўрэяў.

Зусім іншыя лічбы даюць замежныя даследчыкі Халакосту. Так, А.Багровіч называе лічбу ў паўмільена яўрэяў [5], Р.Хільберг – 1 млн. [6]; Дж.Робінсан – 700 тыс.; М.Гілберт - 245 тыс.; У.Левін, Д.Мельцэр –700 390 [7]; а Энцыклапедыя Катастрофы дае лічбу ў 1 млн.чалавек [8]. Нямецкі даследчык К.Герлах лічыць, што ў Беларусі да лета 1942 г. было знішчана 500 000 яўрэяў.

Па нашым падлікам, на беларускай зямлі (у сучасных межах Рэспублікі Беларусь) ахвярамі Халакосту сталі каля 715 тыс. беларускіх і літоўскіх яўрэяў. Акрамя таго, тут было знішчана звыш 90 тыс. яўрэяў з Цэнтральнай, Заходняй і Усходняй Еўропы (з Германіі, Аўстрыі, Чэхаславакіі, Польшчы, Галандыі, Францыі, Венгрыі). Даследчыкамі выяўлена 397 месц знішчэння беларускіх і замежных яўрэяў.

Асноўным выканаўцам "канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання" на беларускай зямлі стала айнзатцгрупа "Б" на чале з генералам паліцыі Артурам Небе. У яе склад увайшлі "зондэркаманды" 7-а і 7-б, "айнзатцкаманды" 8 і 9 агульнай колькасцю 655 афіцэраў і салдат. Яны насілі назву "атрадаў смерці". "Зондэркаманды" у першую чаргу знішчалі камуністаў і яўрэяў, а таксама мірнае насельніцтва розных нацыянальнасцей. У сваіх "акцыях" яны шырока выкарыстоувалі паліцэйскія атрады з ліку мясцовых калабарацыяністаў. Калі б не гэта, айнзатцгрупа "Б" не змагла бы за адносна кароткі тэрмін знішчыць такую вялікую колькасць яўрэяў. У першыя ж месяцы вайны ў злачынных дзеяннях карных каманд самы актыўны ўдзел прынялі літоўскі, латышскі і ўкраінскі батальёны СД.

Метад масавых забойстваў, які прымяняўся айнзатцгрупамі, заключаўся ў наступным: яўрэяў выводзілі з жылішч, падводзілі да папярэдне падрыхтаваных паблізу ад горада, мястэчка, вёскі ямам або процітанкавым рвам. Тут іх расстаўлялі групамі ўздоўж ям і расстрэльвалі, а ямы прысыпалі зямлей. Дзяцей часта закапвалі жывымі.

Больш за ўсё яўрэяў – звыш 143 тыс., у тым ліку больш 80 тыс. замежных яўрэяў было знішчана у Трасцянецкім лагеры смерці.

Аналіз разнастайных крыніц, у тым ліку і нямецкіх, сведчыць аб тым, што Халакост на беларускай зямлі пачаўся літаральна з першых дзен і тыдняў Вялікай Айчыннай вайны. Пасля першай хвалі тэрору застаўшыхся у жывых, але асуджаных на гібель яўрэяў, ізалявалі ад астатняга насельніцтва.

Паўсюдна створаныя ва ўсіх сямі разрозненых рэгіенах Беларусі гета да пэўнага часу служылі нацыстам пунктам сканцэнтравання яўрэйскага насельніцтва, каб лягчэй было трымаць масу людзей пад кантролем, а затым знішчыць у самы кароткі час – у лічаныя дні

Даўно настаў час развеяць міф аб тым, што вязні гета Беларусі ішлі на смерць, быццам пакорныя авечкі. Не, яны змагаліся, не шкадуючы свайго жыцця ў барацьбе з катамі. Разнастайныя аўтарытэтныя крыніцы сведчаць аб паўстаннях у Клецкім, Нясвіжскім, Лахвінскім, Капыльскім, Беластокскім, Глыбоцкім, Слуцкім і іншых гета Беларусі ў 1942—1943 гг.

Вялікую ролю ў выратаванні тысяч беларускіх яўрэяў адыгралі падпольныя арганізацыі, партызанскія фарміраванні і самаахвяраванне беларусаў, рускіх, палякаў, украінцаў, якія, рызыкуючы сваім жыццем, хавалі яўрэяў ад нацыстаў і іх паслугачоў – паліцэйскіх. У нашы дні яны узнагароджаны медалем "Праведнік народаў свету". Такіх людзей у Рэспубліцы Беларусь ужо больш 500.

## ЛІТАРАТУРА


1 *Volacik M.* The Population of Western Belorussia and its Resettlement in Poland and the USSR // Belorussian Review. Munich: Institute for the Study of the USSR. 1956. Pp. 15,16.

2 *Туронак Ю.* Беларусь пад нямецкай акупацыяй. Мн., 1993. С. 62

3 Трагедия евреев Белоруссии в 1941—1944 гг.: Сб. материалов и документов. 2-е испр. и доп. изд. Мн., 1997. С. 28.

4 Мишпоха. 1997. № 3. С. 79.

5 *Бегровіч А.* Жыхарства Беларускай ССР у святле перапісу 1959 году Нью-Ерк-Мюнхен, 1962. С. 65.

6 *Hilberg R.* The Destruction of European Jews. New York, 1961.P 767.

7 *Левин В., Мельцер Д.* Черная книга с красными страніцами. Трагедия и героизм евреев Белоруссии. Балтимор, 1996. С. 90—94.

8 Энциклопедия Катастрофы. Под ред.И.Гутмана.Тель-Авив, 1990.